**Васіль СТАРЫЧОНАК**

# ЛЕКСІЧНЫ АНАЛІЗ

Мэтай лексічнага аналізу з’яўляецца правільнае і дакладнае вызначэнне лексічнага значэння слова і яго характарыстыка з пункту гледжання сферы выкарыстання, стылістычнай афарбоўкі, прыналежнасці да актыўнага ці пасіўнага слоўнікавага запасу, магчымасці мець сінонімы і антонімы. Лексічны аналіз прадугледжвае веданне абітурыентам і школьнікам асноўных лексікалагічных паняццяў, якія прыводзяцца ў табліцах 1, 2, 3, 4.

**1.** **Лексічнае значэнне** — змест слова, яго суаднесенасць з прадметамі, якасцямі, дзеяннямі, працэсамі і інш.

**Прамое** (асноўнае, галоўнае) адлюстроўвае аб’ектыўную рэчаіснасць непасрэдна: *мядзведзь* ‘звер’, *чалавек заснуў*

**Пераноснае** (другаснае, вытворнае) адлюстроўвае аб’ектыўную рэчаіснасць апасродкавана, праз прамое значэнне: *мядзведзь* ‘непаваротлівы чалавек’, *горад заснуў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2.** Лексіка беларускай мовы паводле сферы выкарыстання

Лексіка **абмежаванага выкарыстання**

**Агульнаўжывальная** — словы, добра вядомыя ўсім носьбітам мовы; яны шырока выкарыстоўваюцца ў вуснай і пісьмовай мове (*дом, кніга, сябар, чытаць, ісці, новы, сам, дзесяць)*

**Тэрміны** — афіцыйна ўзаконеныя назвы спецыяльных паняццяў розных галін навукі, тэхнікі, вытворчасці: *лінгвістыка, інтэграл, модуль, ангіна, ямб, прэфікс*

**Прафесіяналізмы** - словы, якія выкарыстоўваюць людзі пэўных прафесій: *фуган* ‘від рубанка’, *шапка* ‘загаловак, агульны для некалькіх артыкулаў’

**Дыялектызмы** - словы народных гаворак, якія не ўваходзяць у склад літаратурнай мовы: *пелька* ‘палонка’, *крушня* ‘куча камення’, *груца* ‘ячменныя крупы’

**Жаргоны** — словы ў гутарковай мове людзей, аб’яднаных агульнымі інтарэсамі, прафесійнымі навыкамі, сацыяльным становішчам: *сціпуха* ‘стыпендыя’, *дзед* ‘салдат апошняга года службы’

**Спецыяльная лексіка**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## 3. Актыўная і пасіўная лексіка

**Актыўная** лексіка — агульназразумелыя, шырокаўжывальныя словы, здольныя абслугоўваць усе сферы чалавечай дзейнасці

**Пасіўная** лексіка --малаўжывальныя словы, якія захоўваюць адценне устарэласці або навізны

**Устарэлыя** словы

**Архаізмы** — даўнейшыя назвы, якія ў працэсе развіцця мовы былі заменены сучаснымі словамі-сінонімамі *(чало-лоб, перст — палец, раць — войска)*

**Гістарызмы** — устарэлыя словы, якія выйшлі з ужытку па прычыне знікнення тых прадметаў і паняццяў, што яны абазначалі *(цівун, войт, дукат, аршын, вярста)*

**Неалагізмы** — словы, што абазначаюць новыя паняцці і яшчэ не набылі агульнай вядомасці і шырокага выкарыстання *(рэйтынг, інвестар, спонсар, маркетынг, біяполе, брокер)*

## 4. Стылістычныя разрады лексікі

**нейтральныя** словы-словы, пазбаўленыя стылістычнай афарбоўкі; яны могуць ужывацца ў любым функцыянальным стылі: *горад, дом, чытаць, ісці, пяць, белы, хутка*

**стылістычна афарбаваныя** словы

**кніжныя** словы — словы, якія выкарырыстоўваюцца ў кніжных стылях (афіцыйна-справавым, навуковым, публіцыстычным, мастацкім): *тэрмін, артыкул, асімілацыя, кліент дыскусія*

**гутарковыя** словы — словы вуснага маўлення з эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай, якія пераважна ўжываюцца ў сферы штодзённых бытавых зносін: *балбатун, хапаць, бярозанька*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

* Лексічны (лексікалагічны) аналіз звычайна праводзяць у наступнай паслядоўнасці:

1. Вызначаецца лексічнае значэнне слова ў тэксце.

2. Вызначаецца тып лексічнага значэння: прамое, пераноснае (* для пераносных — від пераносу: метафара, метанімія, сінекдаха).

3. Вызначаецца сфера выкарыстання: агульнаўжывальнае ці абмежаванага выкарыстання (тэрміналагічнае, прафесійнае, дыялектнае, жаргоннае).

4. Вызначаецца прыналежнасць да пасіўнага (гістарызм, архаізм, неалагізм) ці актыўнага слоўнікавага запасу.

5. Вызначаецца стылістычны разарад: нейтральнае, стылістычна афарбаванае (гутарковае, кніжнае — афіцыйна-справавае, навуковае, публіцыстычнае, мастацкае).

6. Прыводзяцца магчымыя сінонімы і антонімы.

7[1] Вызначаецца паходжанне слова: спрадвечна беларускае (індаеўрапейскае, агульнаславянскае, усходнеславянскае, уласнабеларускае) ці запазычанае. Адзначаюцца характэрныя прыметы запазычанага слова.

Прывядзём некалькі ўзораў лексічнага аналізу:

♦*Між сялян пайшла* ***глухая гаворка****, у якой чулася нейкая трывога. (Я. Колас)*

*Гаворка* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘чутка’ (прамое значэнне — ‘размова’), *від пераносу — метафара . Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *пагалоска*, *размова*, антонімаў не мае. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (усходнеславянскае).

[1] Зорачкамі адзначаны заданні (ці іх часткі), выкананне якіх патрабуецца ў класах з паглыбленым вывучэннем беларускай мовы і ў студэнцкіх аўдыторыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Глухая* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘затоеная, невыразная’ (прамое значэнне — ‘пазбаўленая слыху’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *сакрэтная, затоеная*, антонімы — *выразная, ясная, дакладная.* *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

♦*Сям’я спала на зямлі ў саламяным **логаве**, ратуючыся ад **холаду**. (А. Якімовіч)*

*Логаве* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘непрыгляднае, неахайнае жыллё, пасцель чалавека’ (прамое значэнне — ‘паглыбленне ў зямлі, якое служыць жыллём зверу’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна афарбаванае (гутарковае). Магчымыя сінонімы — *пасцель, полаг, бярлога*, антонімаў не мае. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (усходнеславянскае).

*Холаду* —слова ўжыта ў прамым значэнні ‘нізкая тэмпература навакольнага асяроддзя’, агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае, магчымыя сінонімы — *халадэча, халадзеча, стыласць, стынь, золкасць*, антонімы — *гарачыня, спёка, спякота, цяпло.* *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

♦*Так **веча** рашыла. (Я. Сіпакоў)*

*Веча* — слова ўжыта ў значэнні пераносным значэнні ‘ўдзельнікі сходу’ (прамое значэнне — ‘сход, пасяджэнне’), *від пераносу — метанімія. Слова абмежаванага выкарыстання (тэрміналагічнае), належыць да пасіўнага слоўнікавага запасу (гістарызм), стылістычна афарбаванае (кніжнае). Магчымыя сінонімы — *сход, пасяджэнне,* антонімаў не мае. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

♦*Адгуло, адплыло маё **лета** вазамі — звонкарэхае, я не збярог. (Р. Барадулін)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Лета* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘маладосць, пражытыя гады’ (прамое значэнне — ‘самая цёплая пара года’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — маладосць, юнацтва, вясна, антонімы — зіма, старасць. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

***КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ***

1. Чым адрозніваецца лексічнае значэнне ад граматычнага?
2. Якое значэнне называецца прамым, а якое — пераносным?
3. У чым адрозненне мнагазначных слоў ад амонімаў?
4. Як размяжоўваюцца ў тлумачальных слоўніках амонімы і мнагазначныя словы?
5. Ці могуць метафарычныя пераносы страчваць сувязь з утваральным значэннем і пераходзіць у разрад “прамых” лексічных адзінак? Адказ падмацуйце прыкладамі.
6. Якія вы ведаеце адзінкі вымярэння, названыя імёнамі вядомых вучоных?
7. Што такое сінекдаха? Чым яна адрозніваецца ад метафары і метаніміі?
8. Што такое міжмоўная аманімія? Прывядзіце 5 — 10 прыкладаў беларуска-рускіх міжмоўных амонімаў?
9. Назавіце словы, у якіх змена націску прыводзіць да ўтварэння новага слова. Як называецца такая з’ява?
10. Ці могуць словы розных часцін мовы ўваходзіць у сінанімічны рад?
11. Ці да ўсіх слоў можна падабраць антонімы?
12. Ці з’яўляюцца правільнымі з пункту гледжання мовы выразы накшталт *маладая старасць, гарачы снег, імгненны век*? Як называецца такая з’ява? Прывядзіце 5 — 10 падобных выразаў.
13. Якімі паметамі ў тлумачальных слоўніках суправаджаюцца тэрміны і прафесіяналізмы?
14. Чым адрозніваюцца архаізмы ад гістарызмаў?
15. Што такое матываваная назва? Прывядзіце 5 — 10 прыкладаў матываваных слоў і растлумачце іх этымалогію.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***ТРЭНІРОВАЧНЫЯ ЗАДАННІ***

1. З Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы выпішыце значэнні выдзеленых слоў. Укажыце, гістарызмамі ці архаізмамі яны з’яўляюцца.

У прадзеда пані Яноўскай было дзесяць тысяч **дзесяцін** добрай ворнай зямлі, не лічачы лесу. Новую лазню стары Даніла Кагут вывеў **сажняў** за сто ад берага, куды вышэй за ўласную хату. Між тым волат дайшоў да **лёкая,** які, падслепаваты і глухі, не заўважыў гасцей. Вочы нібыта самі заўважылі нажную **дзіду** побач з трупам паўстанца. Не часта бывае ў такім закутку паўналецце адзінай наследніцы **маярату.** Гэтыя ўмяцінкі я прыкмеціў на першай **балонцы** “Апакаліпсіса”. Праскоўя Зубава папрасіла ў імператрыцы дазволу здаваць сваіх магілёўскіх сялян у **рэкруты.** А тут кажуць: на **ловы** выехаў. Бачу я цяпер, якія гэта **ловы** .*(З твораў У. Караткевіча)*

2. Прывядзіце сінонімы да слоў *белы, есці, сябар, ісці.*

3. Прывядзіце антонімы да наступных слоў.

Талент, учарашні, холадна, студэнт, атака, баязлівы, бедны, дрэва, вясёлы, вясна, знявага, пяць, надзея, лазер, Васіль.

4. Зрабіце лексічны аналіз выдзеленых слоў.

К *вясне* б маёй хацеў вярнуцца. *(Я. Колас)* Ты *стары ліс* і хады ўсе ведаеш не горш за свайго пана, але параду маю паслухай. (*А. Пальчэўскі*) *Прыйшла* зіма з марозам, *заснуў* і лес і бор. (*Я. Журба*) Сябе абганяючы самі, *ідуць* маладыя гады. *(Р. Барадулін*) Бацька і тут, у атрадзе, адчувае сябе *галавой* сям’і. *(І. Шамякін) Мінск* правяраў лязо мяча, на неба не глядзеў з-за кратаў, сек лютых злыдняў з-за пляча. *(Р. Барадулін)*

***Т Э С Т “ЛЕКСІКА”***

**1. У слоўнікавым складзе сучаснай беларускай літаратурнай мовы налічваецца[2]:**

а) каля 86 тысяч слоў;

[2] Пры вызначэнні слоўнікавага складу беларускай мовы неабходна карыстацца дадзенымі 5-томнага Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы (мн., 1977 — 1984).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

б) каля 100 тысяч слоў;

в) больш за 65 тысяч слоў.

**2. У якім слоўніку тлумачацца лексічныя значэнні слоў:**

а) у фразеалагічным;

б) у слоўніку сінонімаў;

в) у этымалагічным;

г) у тлумачальным?

**3. Знайдзіце матываваныя назвы:**

а) ліпень, апенькі, падасінавік, мухамор, прадзед;

б) праца, сабака, легенда, вясна, радасць;

в) знічка, падаконнік, чарніцы, жнівень, цвыркун.

**4. Мнагазначнае слова — гэта:**

а) слова, якое мае некалькі значэнняў, прама ці апасродкавана звязаных паміж сабой;

б) слова з некалькімі значэннямі, якія развіліся на базе пераноснага (зыходнага) значэння;

в) слова з некалькімі рознымі, семантычна не звязанымі значэннямі.

**5. У прамым ці пераносным значэнні ўжыты падкрэсленыя словы?**

5. 1. Час бяжыць — а) прамое; б) пераноснае

5. 2. Горад заснуў — а) прамое; б) пераноснае

5. 3. Мяккая падушка — а) прамое; б) пераноснае

5. 4. Залатое кальцо — а) прамое; б) пераноснае

5. 5. Залаты характар — а) прамое; б) пераноснае

5. 6. Крыло птушкі — а) прамое; б) пераноснае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**6. Укажыце групу аманімічных слоў:**

а) газавая пліта і газавая сукенка, крытычны артыкул і крытычны ўзрост, радавы выпадак і радавы маёнтак, перакладны слоўнік і перакладны экіпаж;

б) сумная дзяўчына і сумная вестка, глухая жанчына і глухая вуліца, лёгкая коўдра і лёгкая хада, вясёлы ранак і вясёлы настрой;

в) корань зуба і корань слова, канцэртная зала і рэакцыя залы, крыло птушкі і крыло самалёта, цяжкі пераход праз вяршыню і шырокі пазначаны пераход на вуліцы;

г) клуб аматараў песні і клуб пылу (туману), сталовая соль і соль у музычнай гаме, цэнтральны праспект горада і праспект навуковай кнігі, русая каса і пясчаная каса.

**7. Знайдзіце амографы:**

а) адсыпацца пасля цяжкай працы і адсыпацца з поўнага меха, марыць пра будучае і марыць голадам, вараны конь і вараны бурак, кара за злачынства і лазовая кара;

б) дабыць да восені і дабыць важныя звесткі, знасіць касцюм і знасіць папрокі, пад'ёмны кран і вадаправодны кран, іграць туш і каляровая туш;

в) пусціць каня ў кар'ер і пясчаны кар'ер, супрацьтанкавая міна і насмешлівая міна, надушыць насоўку (духамі) і надушыць сліў, нота пратэсту і нота "фа";

г) закапаць сукенку чарнілам і закапаць яму, парыцца ў рэчах і парыцца ў лазні, ранішняя раса і негроідная раса, жытняя мука і тужлівая мука.

**8. З пункту гледжання сінаніміі знайдзіце "пятае лішняе":**

8. 1. а) баязлівы; б) палахлівы; в) нерашучы; г) рашучы; д) пужлівы;

8. 2. а) бяда; б) ліха; в) гора; г) няшчасце; д) радасць;

8. 3. а) зусім; б) поўнасцю; в) цалкам; г) крыху; д) ушчэнт;

8. 4. а) блізка; б) недалёка; в) побач; г) паблізу; д) далёка;

8. 5. а) злосць; б) прыязнасць; в) гнеў; г) варожасць; д) нянавісць.

**9. Знайдзіце няправільнае сцвярджэнне:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а) антонімамі звычайна з’яўляюцца словы з супрацьлеглым якасным значэннем;

б) кожнае значэнне мнагазначнага слова можа мець свае антонімы;

в) антонімамі могуць быць рознакаранёвыя і аднакаранёвыя словы;

г) антонімы можна прывесці практычна да слоў любой часціны мовы;

д) антонімы могуць быць моўнымі і кантэкставымі.

**10. Укажыце групу слоў з тэрміналагічным значэннем:**

а) выказнік, суфікс, флексія, дзеяслоў, абрэвіяцыя;

б) стол, дзверы, шафа, акно, шуфляда;

в) хвароба, лекі, дапамога, бальніца, аптэка;

г) санет, харэй, рыфма, рэфрэн, трыялет.

**11. Неалагізмы — гэта:**

а) новыя словы, якія ўзніклі ў пэўны перыяд для абазначэння новых прадметаў, паняццяў, з’яў;

б) новыя словы, якія называюць новыя прадметы, паняцці, з’явы, успрымаюцца з адценнем навізны і не фіксуюцца ў сучасных тлумачальных слоўніках;

в) словы актыўнага слоўнікавага складу, якія ўжываюцца з новым значэннем.

**12. Знайдзіце неалагізмы.**

а) метро, біятлон, касманаўт, капрон, луназод;

б) брокер, прэсінг, імідж, маркетынг, чартэр;

в) фламастэр, дызайнер, траса, сервіс, калькулятар.

**13. Архаізмы — гэта:**

а) устарэлыя словы, якія абазначаюць прадметы, з’явы і паняцці мінулых эпох і невядомы шырокаму чытачу;

б) устарэлыя назвы сучасных прадметаў, з’яў і паняццяў, якія выйшлі з актыўнага ўжытку, заменены іншымі;

в) сучасныя назвы старадаўніх прадметаў, з’яў і паняццяў.

**14. Якая група слоў адносіцца да архаізмаў?**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а) кальчуга, веча, цівун, войт, пішчаль;

б) бортнік, перст, чало, лёкай, ловы;

в) рэкрут, харунжы, сажань, гетман, дзіда.

*АДКАЗЫ ДА ТРЭНІРОВАЧНЫХ ЗАДАННЯЎ І ТЭСТА*

1. *Дзесяціна* — мера зямельнай плошчы (1,09 га), якой карысталіся да ўвядзення метрычнай сістэмы (гістарызм), *сажань* — старая мера даўжыні, роўная 2, 134 м., якая ўжывалася да ўвядзення метрычнай сістэмы (гістарызм), *лёкай* — лакей (архаізм), *дзіда* — старадаўняя калючая зброя, піка (гістарызм), *маярат* — памесце, зямельнае ўладанне, якое перадаецца ў спадчыну (гістарызм), *балонка* — старонка кнігі (архаізм), *рэкрут* — салдат-навабранец (гістарызм), *ловы* — паляванне без агнястрэльнай і халоднай зброі (архаізм).

2. *Белы* — бледны, невыразны, бясколерны, няяркі, малочны, васковы, збялелы, бяскроўны, светлы, чысты, ясны, крыштальны, сівы, серабрысты.

*Есці* — з’ядаць, жывіцца, карміцца, харчавацца, спажываць, сталавацца, закусваць, перакусваць, ласавацца, сілкавацца, падсілкоўвацца, падмацоўвацца, гамаць, жэрці, зжыраць, уплятаць, упісваць. церабіць, малаціць.

*Сябар* — сябрук, дружбак, дружбан, дружака, пабрацім, таварыш, калега, друг, прыяцель, брат.

*Ісці* — ступаць, крочыць, маршыраваць, плесціся, пхнуцца, цягнуцца, сунуцца, валачыцца, цёпкацца, цялёпкацца, цялюхкацца, цюпаць, клыгаць, клыпаць, брысці, тэпаць, тупаць, трапаць, сыпаць, дыбаць, шыбаваць, шыбаць, часаць, сігаць, чухаць, біць ногі, сунуць ногі і інш.

3. Талент — бяздарнасць; учарашні — заўтрашні; холадна — цёпла; студэнт (антонімаў нельга прывесці); атака — абарона; баязлівы — смелы, храбры; бедны — багаты, заможны; дрэва (антонімаў нельга прывесці); вясёлы — маркотны, пануры, сумны, хмуры; вясна — восень; знявага —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

павага; пяць (антонімаў нельга прывесці); надзея — адчай, роспач, расчараванне; лазер (антонімаў нельга прывесці); Васіль (антонімаў нельга прывесці).

4. *Вясна* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘светлая пара жыцця, юнацтва’ (прамое значэнне — ‘пара года паміж зімой і летам’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *маладосць, юнацтва, вясна*, антонімы — *зіма, старасць*. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

*Стары* — слова ўжыта ў прамым значэнні ‘які пражыў шмат год, дасягнуў старасці’. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *даўнішні, старадаўні*, антонім — *малады*. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

*Ліс* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘хітры, ліслівы чалавек’ (прамое значэнне — ‘драпежная жывёліна’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна афарбаванае (гутарковае). Магчымыя сінонімы — *ашуканец, падманшчык, пранырa, хітрэц,* антонімаў не мае. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

*Прыйшла* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘наступіць, настаць’ (прамое значэнне — ‘ідучы, дасягнуць якога-небудзь месца, прыбыць’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *наступіла, надышла*, антонім — *адышла*. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

*Заснуў* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘заціхнуць, замерці’ (прамое значэнне — ‘прыйсці ў стан сну’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *заціхнуў, замоўкнуў,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*змоўкнуў,* антонімы — *загаманіў, ажыў.* *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

*Ідуць* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘мінаць, праходзіць у часе’ (прамое значэнне — ‘рухацца, робячы крокі’), *від пераносу — метафара. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *цягнуцца, ступаюць, крочаць, тупаюць, клыпаюць, рухаюцца,* антонім — *стаяць.* *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

*Галавой* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘старэйшы ў сям’і, гаспадар, кіраўнік’ (прамое значэнне — ‘верхняя частка цела чалавека’), *від пераносу — сінекдаха. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымыя сінонімы — *кіраўнік, начальнік, камандзір, старшы, распарадчык, шэф,* антонімаў не мае. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (агульнаславянскае).

*Мінск* — слова ўжыта ў пераносным значэнні ‘жыхары Мінска, яго абаронцы’ (прамое значэнне — ‘горад’), *від пераносу — метанімія. Агульнаўжывальнае, належыць да актыўнага слоўнікавага запасу, стылістычна нейтральнае. Магчымы сінонім — *горад,* антонімаў не мае. *Па паходжанні — спрадвечна беларускае (уласнабеларускае).

*ТЭСТ “ЛЕКСІКА”*

За кожны правільны адказ налічваецца два балы, за няпоўны адказ (адзін з двух правільных) — адзін бал, за няправільны — балаў не налічваецца. Максімальная колькасць балаў — 28. Выніковая адзнака за выкананне тэста прыводзіцца ў наступнай табліцы (яна можа ўдакладняцца ў залежнасці ад узросту школьнікаў, спецыфікі навучання мове — звычайны клас, клас з паглыбленым вывучэннем мовы, педагагічны клас і інш.):

| | |
|---|---|
| Менш 14 балаў | Тэма не засвоена (“2”). Слоўнікавы запас вельмі бедны.Неабходна тэрмінова звярнуцца да падручнікаў і іншай спецыяльнай літаратуры, паўтарыць пройдзеныя матэрыялы. Карысць можа |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | прынесці павольнае і ўдумлівае чытанне тэкстаў на самыя разнастайныя тэмы. |
| Ад 14 да 23 балаў | Тэма засвона здавальняюча (“3”). Неабходна звярнуцца да падручнікаў, паўтарыць матэрыялы і зноў выканаць тэст. Павышайце свой кругагляд, часцей заглядвайце ў слоўнікі. |
| Ад 24 да 26 балаў | Тэма ў асноўным засвоена (“4”). Паўтарыце правілы, на якія здапушчаны памылкі і зноў выканайце заданні тэста. Часцей карыстайцеся тлумачальным слоўнікам. |
| 26 — 28 балаў | Вас можна павіншаваць! Вы выдатна засвоілі матэрыялы па лексіцы. Ваш кругагляд даволі шырокі, слоўнікавы запас багаты. |

**1.** — б; **2.** — г; **3.** — а, в; **4.** —а; **5.1.** — б; **5.2**. — б; **5.3.** — а**; 5.4**. — а; **5.5**. — б; **5.6. —** а; **6**. — а, г; **7**. — а, г; **8.1. — г; 8. 2**. — д; 8**.3.** — г; **8.4**. — г; **8.5.** — б; **9.** — г; **10.** — а, г; **11.** — б; **12**. — б; **13.** — б; **14** — б.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ